## ЦІ НА РАДАСЦЬ ПАВЫШЭННЕ ЗАРПЛАТЫ?

Дзяржкампрацы СССР 20 сакавіка 1991 г. прыняў пастанову № 70, якой зацверджаны новыя размеры ставак заработнай платы і пасадавых акладаў работнікаў народнай адукацыі, аховы здароўя, сацыяльнага забеспячэння, культуры і архіўных устаноў. У адпаведнасці з гэтай пастановай у новыя стаўкі і аклады ўключаецца кампенсацыя дадатковых расходаў, звязаных з павышэннем рознічных цэн.

Новыя стаўкі і аклады ўстанаўліваюцца па выніках атэстацыі іператарыфікацыі.

У пастанове (п. 3), у прыватнасці, гаворыцца: «Стаўкі і аклады, устаноўленыя ў адпаведнасці з гэтай пастановай, з'яўляюцца дзяржаўнымі гарантыямі мінімальных узроўняў аплаты працы для канкрэтных прафесіянальна-кваліфікацыйных груп работнікаў, якія знаходзяцца ў працоўных адносінах з установамі і арганізацыямі ўсіх форм уласнасці пры захаванні ўстаноўленай працоўным заканадаўствам працягласці рабочага часу і пры выкананні работнікам працоўных абавязкаў (норм працы)».

З канкрэтнымі размерамі новых ставак і акладаў часткова можна азнаёміцца па публікацыі «Учительской газеты» ад 26 сакавіка г. г. Аднак, думаецца, і гэта знаёмства, і ўзровень павышаных ставак і пасадавых акладаў работнікам народнай адукацыі, і, у прыватнасці, вышэйшай школы нікога не парадуюць. Нават па самых спрошчаных падліках яны вельмі далёкія ад тых затрат, якія мы будзем несці ад высокага павышэння цэн на прадукты, прамысловыя і іншыя тавары, якія ніяк не назавеш раскошай. А ў дадатак яшчэ і падаражанне ўсемагчымых паслуг. Так што вартасць рубля цяпер, можна сказаць, амаль не мае ніякай вартасці.




# Гомельскі універсітэт

ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

№ 12 (799) | Аўторак, 9 красавіка 1991 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 3 кап.


20-га КРАСАВІКА У НАШАЙ КРАІНЕ АДБУДЗЕЦЦА ТРАДЫЦЫЙНЫ УСЕСАЮЗНЫ КАМУНІСТЫЧНЫ СУБОТНІК, ПРЫСВЕЧАНЫ 121-й ГАДАВІНЕ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ У. І. ЛЕНІНА. ГАНАРОВЫ АБАВЯЗАК УСІХ ЧЛЕНАЎ УНІВЕРСІТЭЦКАГА КАЛЕКТЫВУ РАЗГАРНУЦЬ АКТЫЎНУЮ ПАДРЫХТОЎКУ ДА «ЧЫРВОНАЙ СУБОТЫ» І ПРЫНЯЦЬ У СВЯЦЕ ПРАЦЫ МАСАВЫ ЎДЗЕЛ.

11 красавіка на сесіі Цэнтральнага раённага Савета народных дэпутатаў г. Гомеля будзе заслухана і абмеркавана справаздача яго выканкома аб праведзенай рабоце за перыяд з чэрвеня 1990 года па сакавік 1991 года.

Прапануем увазе нашых чытачоў змест гэтай справаздачы.

*Слова пра ленінскага стыпендыята*

## КАЛІ ЁСЦЬ МЭТА

Пяць вучэбных семестраў за плячыма Уладзіміра Архіпенкі — трэцякурсніка фізічнага факультэта, а ў заліковай кніжцы адзнака толькі адной вартасці — «выдатна». Думаецца, што гэтым сказана многае. І таму Уладзіміру прызначана ленінская стыпендыя.

Звычайна, захапленне тым ці іншым прадметам пачынаецца яшчэ са школьных гадоў і потым прыводзіць да ўсвядомленага выбару будучай прафесіі. Так было і ва Уладзіміра. Фізіка вабіла яго больш за ўсё, але не ў ахвяру іншым дысцыплінам. СШ № 46 г. Гомеля ён закончыў з сярэбраным медалём.

Доўгіх разважанняў, куды пайсці вучыцца далей, у юнака не было. Яшчэ ў старэйшых класах на занятках у вучэбна-вытворчым камбінаце выбраў спецыяльнасць, звязаную з вылічальнай тэхнікай, электронікай. Таму і вырашыў далей набываць і ўдасканальваць веды на фізічным факультэце Гомельскага дзяржуніверсітэта. На трэцім курсе выбраў спецыялізацыю — фізічную кібернетыку.



Як дасягаецца поспех у вучобе? Уладзімір адказаў на гэта пытанне без доўгіх разваг. Ён не лічыць, што старанныя адносіны да вучобы —гэта нейкая заслуга студэнта. Гэта — неабходнасць, без якой нельга стаць спецыялістам, адпавядаючым патрабаванням сённяшняга дня. Многія студэнты лічаць, што можна абысціся без наведвання лекцый, тым больш, што цяпер яно з'яўляецца неабавязковым. Уладзімір Архіпенка прытрымліваецца іншага меркавання. Яму, напрыклад, грунтоўная лекцыя выкладчыка прыносіць значна большую карысць, чым акадэмічны падручнік, у якім не заўсёды лёгка можна разабрацца самому. А ёсць яшчэ і выкладчыкі, на лекцыі якіх хочацца ісці. На фізічным факультэце з ліку тых выкладчыкаў, якія вялі заняткі да трэцяга курса, Уладзімір перш за ўсе выдзяляе дацэнта В. М. Капшая за яго прафесіяналізм, кантакт са студэнтамі.

У многіх, на жаль, аб выдатніках вучобы складваецца ўражанне, быццам бы яны за вучобай не заўважаюць усіх лепшых бакоў студэнцкага жыцця, ператвараюць яе ў самамэту. Такія людзі кажуць: «І навошта ім гэта? Сёння ж усім стыпендыю плацяць, абы сесіі здаваў «без хвастоў». Але для Архіпенкі толькі выдатнае авалодванне ведамі па выбранай спецыяльнасці не перашкаджае яму быць і цікавым чалавекам, субяседнікам. Ён добра разбіраецца не ў адных толькі спецыяльных дысцыплінах, выдатна валодае французскай мовай, бо заканчваў школу з паглыбленым яе вывучэннем, меў магчымасць удасканальвацца ў ёй у час паездкі ў саставе школьнай дэлегацыі ў горад-пабрацім г. Гомеля — Клермон-Феран. Паспрабаваў Уладзімір ужо ў якасці студэнта і «будатрадаўскай кашы», калі ў час летніх канікулаў выязджаў працаваць у Балгарыю.

Калі ў чалавека ёсць мэта, ён ідзе да яе ўпэўнена, не баючыся цяжкасцей, бо знаходзіць у сабе сілы на іх пераадольванне. А мэта ва Уладзіміра — стаць добрым спецыялістам-кібернетыкам. Можна не сумнявацца, што ён яе дасягне.

Т. ДУБЯК.

## ВЫКАНКОМ ДАЕ СПРАВАЗДАЧУ

ЗА СПРАВАЗДАЧНЫ перыяд праведзена 21 пасяджэнне выканаўчага камітэта райсавета, на якіх разгледжана больш за 70 сацыяльна-значных пытанняў. Акцэнт рабіўся на павелічэнне вытворчасці тавараў народнага спажывання і платных паслуг насельніцтву, забеспячэнне грамадзян жыллём, паляпшэнне работы сферы паслуг і вытворчага забеспячэння, аказання сацыяльнай дапамогі і інш. У выніку выконваліся дагаворныя абавязацельствы прадпрыемствамі лёгкай прамысловасці па пастаўках прадукцыі арганізацыям гандлю горада і раёна. На неспецыялізаваных прадпрыемствах раёна выпушчана тавараў больш чым на 25 млн. руб., асвоена 35 новых вырабаў. У аб'яднанні імя С. М. Кірава выпушчана звыш 3 тыс. пральных машын, у аб'яднанні «Вымяральнік» — 2,5 тыс. індывідуальных дазіметраў.

Аднак агульны аб'ём тавараў народнага спажывання (ТНС) знізіўся ў параўнанні з 1989 годам на 28,9 млн. руб. або на 5,7%. Адмоўная дынаміка захавалася і сёлета. За першыя два месяцы ў параўнанні з адпаведным перыядам 1990 г. вытворчасць ТНС зменшылася на 15,3 млн. руб. або на 17,6%, у тым ліку харчовых тавараў (фабрыка «Спартак») на 12,3 млн. руб. або на 45%.

На 908 тыс. руб. знізіўся выпуск папярова-белавых тавараў на фабрыцы «Палесдрук», на 371 тыс. пар зменшылася вытворчасць панчошна-шкарпэтачных вырабаў на фабрыцы «8 Сакавіка». ВША «Камінтэрн» выпусціла на 1,5 млн. руб. менш швейных вырабаў, а абутковае ВА «Праца» — на 2,3 млн. руб. або на 158 тыс. пар менш абутку.

Апераджальнымі тэмпамі растуць аб'ёмы платных паслуг насельніцтву. Разам з тым каля 30 прадпрыемстваў і арганізацый, або кожнае трэцяе з іх, знізілі тэмпы росту з-за незабяспечанасці матэрыяламі.

На больш поўнае задавальненне патрэб людзей была накіравана і палітыка выканкома па стварэнню малых прадпрыемстваў, кааператываў, аб'яднанняў, асацыяцый і іншых таваравытворцаў. Летась 76 кааператываў выпусцілі тавараў і аказалі паслуг на 57,9 млн. руб. Выканкомам райсавета зарэгістравана каля 40 малых прадпрыемстваў. Імі прадугледжваецца выпусціць сёлета тавараў народнага спажывання больш чым на 8 млн. руб.

(Заканчэнне на 2-й стар.).

## ВІНШУЕМ!

Дэканат эканамічнага факультэта, кафедра эканомікі і кіравання вытворчасцю віншуюць выпускніка універсітэта, аспіранта-завочніка ст. выкладчыка Брэсцкага політэхнічнага інстытута ЧАРНАВАЛАВА Аляксандра Віктаравіча (навуковы кіраўнік — дацэнт І. П. Трацэўскі) з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата эканамічных навук.

# ВЫКАНКОМ ДАЕ СПРАВАЗДАЧУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Каля 100 грамадзян атрымалі права на індывідуальную працоўную дзейнасць па аказанню транспартных паслуг, па вытворчасці швейных і трыкатажных вырабаў, пашыву галаўных убораў, рамонту абутку, вырабу сувеніраў і г. д.

Прымаліся меры па наведзенню парадку ў гандлі, паляпшэнню забеспячэння жыхароў раёна харчовымі і прамысловымі таварамі. Ва ўмовах пастаянна ўзрастаючага пакупніцкага буму, звязанага з рэформай рознічных цэн, штонебудзь істотнае зрабіць было немагчыма. Паліцы хутка пусцеюць, незадавальненне і раздражняльнасць людзей узрасталі. Толькі за два месяцы бягучага года рознічны тавараабарот павялічыўся на 23% або на 13 млн. руб., у тым ліку па універмагу «Гомель» — на 33,1%, гарпрамгандлю № 1 — 20,1%, райхарчгандлю — на 15,2%. Увядзенне талонаў, візітных картак, забеспячэнне грамадскага парадку ў чэргах патрабавала шмат сіл і часу як у выканкома, так і яго аддзелаў, але не змагло даць патрэбнага эфекту. І ўсё ж арганізацыйныя намаганні выканкома дазволілі падтрымліваць устойлівае забеспячэнне насельніцтва прадуктамі і іншымі таварамі першай неабходнасці. У асноўным былі вырашаны пастаўленыя задачы па забеспячэнню раёна гароднінай, аказанню дапамогі па ўборцы ўраджаю. Калектывамі раёна адпрацавана ў калгасах і саўгасах 800 машына-змен, 18 тыс. чалавека-дзён, нарыхтавана 3800 тон бульбы, 250 т капусты, 215 т буракоў, 190 т морквы.

Працягвалася развіццё сацыяльнай сферы і галін эканомікі, прама звязаных з матэрыяльнымі патрэбамі людзей. На рэканструкцыі фабрык «8 Сакавіка» і «Спартак» асвоена адпаведна 5,6 і 3,3 млн. руб. Завершана будаўніцтва крытага рынку на 600 гандлёвых месц з магазінам «Гародніна-фрукты». У 17-м мікрараёне ўведзены ў эксплуатацыю дзіцячы сад на 330 месц з басейнам. Тут жа вядзецца будаўніцтва школы з басейнам на 1722 вучні, якую запланавана ўвесці ў жніўні 1991 г., і дзіцячага сада з басейнам на 330 месц з уводам у апошнім квартале г. г.

Распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя для прыбудоў да СШ № 16 і № 26. Уведзена 4,5 тыс. кв. м жылля.

За справаздачны перыяд выканкомам размеркавана 105 кватэр, з іх 17 інвалідам вайны, сем'ям загінуўшых ваеннаслужачых, 8 — удзельнікам вайны, 7 — удзельнікам выканання інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістане. У 17-м мікрараёне сфарміраваны два ЖБК, у якія ўключана 61 сям'я грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Акрамя таго ў фарміруемы цяпер жыллёва-будаўнічы кааператыў уключаны яшчэ 44 сям'і, 20 з якіх — па эвакапасведчаннях. Аднак істотных зрухаў у забеспячэнні насельніцтва раёна жыллём яшчэ не адбылося.

У мэтах навядзення парадку быў праведзены ўлік маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у працоўных калектывах аўтарэмзавода, фабрыкі «8 Сакавіка», ВА імя С. М. Кірава, аблкнігагандлю, абласной СЭС, скурвендыспансера, фабрыкі мастацкіх вырабаў і фабрыкі па пашыву і рамонту адзення «Элегант», абласной дзіцячай бальніцы. У выніку праведзенай работы спісы стаяўшых на чарзе прыведзены ў адпаведнасць з жыллёвым заканадаўствам.

Да бягучага навучальнага года своечасова былі падрыхтаваны ўсе школьныя, дашкольныя і пазашкольныя навучальныя ўстановы. Капітальна адрамантавана СШ № 16. Звыш 700 тыс. руб. асвоена на іншых аб'ектах народнай адукацыі. На бягучае ўтрыманне школ і дзіцячых дашкольных установ, набыццё вучэбна-наглядных дапаможнікаў і абсталявання ў 1990 годзе дадаткова было выдзелена 540 тыс. руб. Працягваецца работа па камп'ютэрызацыі школ. На ўстаноўку вылічальнай тэхнікі ў СШ №№ 10, 26, 56 прадугледжана выдзеліць 60 тыс. руб.

У сакавіку г. г. выканком разгледзеў праграму далейшага ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў народнай адукацыі раёна. Для яе рэалізацыі неабходна адшукаць звыш 1 млн. руб. З мэтай забеспячэння раёна педагагічнымі кадрамі распрацавана перспектыўная комплексная праграма. Прымаюцца меры па паляпшэнню сацыяльна-бытавых умоў настаўнікаў. У бягучым годзе кожнаму з 10 педкалектываў школ выдзелена па адной дзяржаўнай кватэры. У наступным годзе плануецца іх выдзяленне і для работнікаў дашкольных устаноў.

В ўмовах пераходу да рынку выканкомам праводзіцца работа па сацыяльнай абароне настаўнікаў. Адшукваюцца магчымасці па выдзяленню бюджэту раёна дадаткова да фонду заработнай платы асігнаванняў з мэтай аказання матэрыяльнай дапамогі настаўнікам у размеры ставак пры ўходзе ў водпуск. Вырашаюцца пытанні пазачарговага зубапратэзіравання, забеспячэння таварамі народнага спажывання.

Выканком райсавета пастаянна трымае ў полі зроку пытанні аздараўлення і медыцынскага абслугоўвання насельніцтва ў сувязі з абстаноўкай пасля чарнобыльскай катастрофы. За летні перыяд 1990 года ў Саратаўскай, Уладзімірскай і Маскоўскай абласцях, Стаўрапольскім і Краснадарскім краях адпачыла 8,5 тыс. вучняў і педагогаў або практычна кожны, хто меў жаданне выехаць за межы Гомельшчыны. У чатырох лагерах працы і адпачынку, пяці піянерлагерах прадпрыемстваў і арганізацый раёна адпачыла больш 1000 вучняў. Гэта работа працягваецца і ў бягучым навучальным годзе. У перыяд з верасня па сакавік 1887 вучняў СШ №№ 16, 26, 27, 56, 19, 24 аздаравілася ў здраўніцах Літвы, Туапсе, Адлера, Сочы, Феадосіі, Нальчыка, Нарачы.

Выканкомам выдзелены дадатковыя асігнаванні для павышэння каларыйнасці харчавання дашкольных устаноў. На медабсталяванні, набытым для медсанчасці будаўнікоў, праведзена бясплатнае абследаванне дзяцей дашкольных устаноў і вучняў СШ №№ 10, 11, 16, 19. Заканчэнне гэтай работы запланавана на 1991 год. Даныя на кожнага прайшоўшага праверку закладваюцца ў ЭВМ для наступнага кантролю за станам здароўя дзяцей.

У 1990 годзе за кошт свабодных астаткаў бюджэтных сродкаў і сродкаў, дадаткова атрыманых у працэсе выканання бюджэту, выдзелены асігнаванні для аўтаматызаванай сістэмы кіравання на базе персанальных ЭВМ бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі на 611,3 тыс. руб., медсанчасці будаўнікоў — 730 тыс. руб., дзіцячай паліклінікі № 1 — 500 тыс. руб. Набыта дыягнастычная апаратура СІЧ і УЗІ для бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі на 60 тыс. руб., медсанчасці будаўнікоў — 250 тыс. руб. Выдзелены сродкі на павышэнне заработнай платы медперсаналу бальніцы хуткай медыцынскай дапамогі ў памеры 52 тыс. руб. Для медработнікаў выдзелена 5 кватэр.

Выканком пастаянную ўвагу ўдзяляе паляпшэнню сацыяльнага абслугоўвання і матэрыяльнага становішча інвалідаў і пенсіянераў, шматдзетных і малазабяспечаных сем'яў. У цяперашні час на ўліку ў аддзеле сацзабеспячэння 12,5 тыс. пенсіянераў. Больш 200 чалавек, у тым ліку 105 інвалідаў, знаходзяцца на поўным абслугоўванні. На выплаты пенсій і дапамог зрасходавана больш 21 млн. руб.

У 1990-91 г.г. перагледжаны пенсіі 2,5 тыс. удзельнікаў і інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. 106 чалавекам, якія не атрымоўвалі ніякіх пенсій, назначаны сацыяльныя. Выдзелена 700 бясплатных пуцёвак непрацуючым пенсіянерам і інвалідам. Адзінокім грамадзянам аказана матэрыяльная дапамога на суму 43 тыс. руб. і зроблена больш 15 тыс. розных бытавых паслуг. Усе асобы, якія маюць права на льготы, замацаваны для гандлёвага абслугоўвання харчовымі і прамысловымі таварамі. У парадку выключэння ў раёне абслугоўваюцца 34 сям'і дзяцей-інвалідаў ва ўзросце да 16 гадоў.

У апошні час значна ўзрос аб'ём работы ў сувязі з пераразлікам пенсій у залежнасці ад пенсійнага стажу, а таксама ўдзельнікам ліквідацыі вынікаў аварыі на ЧАЭС. Гэтыя пераразлікі датычацца больш 10 тыс. чал.

Ажыццяўляемы выканкомам комплекс мер дапаўняецца магчымасцямі многіх працоўных калектываў раёна. Так, на фабрыцы «8 Сакавіка» 32 малазабяспечаным пенсіянерам устаноўлены даплаты да пенсій па 15 рублёў у месяц. У вытворчым аб'яднанні «Праца» 30 адзінокім пенсіянерам робіцца даплата да 85 рублёў. Кааператывамі «Памяць» і «Сучаснік» для малазабяспечаных і інвалідаў былі нарыхтаваны на зіму бульба і гародніна, а таксама афармлена падпіска на газеты і часопісы. За кошт сродкаў прадпрыемстваў раёна выдзелена талонаў на бясплатнае харчаванне і льготных пуцёвак на 150 тыс. руб.

У справаздачны перыяд выканком дамагаўся паляпшэння работы аддзела ЗАГС. Праведзены капітальны рамонт яго будынка, на што затрачана 64,8 тыс. руб. Укараняюцца новыя абрады і паслугі.

Выканком працягваў ажыццяўляць фінансаванне і кантроль за правядзеннем капітальнага рамонту і бягучага ўтрымання ў тэхнічна спраўным стане наяўнага жылога фонду. У мінулым годзе на гэтыя мэты было зрасходавана 1260 тыс. руб., а сёлета запланавана 2175 тыс. руб. бюджэтных асігнаванняў. Капітальнага рамонту цяпер патрабуе 39,5% жыллёвага фонду, які знаходзіцца на абслугоўванні жыллёва-рамонтнага эксплуатацыйнага трэста.

У плане сёлетняга года рэканструкцыя дамоў № 17б па вул. Кніжнай, № 13 па вул. Сялянскай, капітальны рамонт дамоў № 11 і 23 па вул. 3-я Авіяцыйная, № 11 па праспекту Леніна, № 11 па вул. Камунараў, № 1а па вул. Валатаўской, № 17 па вул. Партовай, № 70 па вул. Ландышава і № 32 па вул. Гагарына.

Перспектыўным планам на 1991-95 г.г. прадугледжана капітальна адрамантаваць 91 жылы дом. Пры цяперашнім становішчы штогод рамантуецца толькі 3—7 аб'ектаў. У сувязі з гэтым мэтазгодна прынясце на сесіі зварот ў вышэйстаячыя савецкія органы з просьбай аб фарміраванні магутнай падраднай рамонтна-будаўнічай арганізацыі, або аб перапрафіліраванні наяўных будаўнічых структур для арганізацыі капітальнага рамонту і правядзення рэканструкцыі жылога фонду.

Выканком удзяляў пастаянную ўвагу правядзенню бягучага рамонту, эксплуатацыі і ўтрыманню жылога фонду. Аднак крайне вострай застаецца праблема перасялення жыхароў старых дамоў. Для гэтых мэт патрэбна каля 300 кватэр агульнай плошчай звыш 15 тыс. кв. м.

Актуальным застаецца пытанне аб аптымальным рэжыме цеплазабеспячэння жыхароў раёна. У сувязі з адсутнасцю рэзерваў магутнасцей на Цэнтральнай кацельнай узнікла неабходнасць падключэння некаторых дамоў (па вуліцах Перамогі, Кірава, Тэльмана, Кніжнай, Савецкай і інш.) да Паўночнай кацельні горада.

Больш сур'ёзная ўвага ўдзялялася выканкомам развіццю базы камунальнай гаспадаркі, добраўпарадкаванню вуліц і дваровых тэрыторый, навядзенню належнага санітарнага парадку. На гэтыя мэты ў справаздачным перыядзе зрасходавана 715 тыс. рублёў.

Марудна вырашаецца праблема забеспячэння жыхароў раёна месцамі ў гаражных кааператывах. З 3700 грамадзян, якія маюць ва ўласным карыстанні аўтамабілі, у спісы маючых патрэбу ў гаражах занесена 640 чалавек, у тым ліку 55 стаяць у льготнай чарзе. Па стану на 1 красавіка г. г. у Цэнтральным раёне зарэгістраваны і дзейнічаюць 10 гаражных і гаражна-будаўнічых кааператываў. Ёсць некалькі гаражных аб'яднанняў, якія не зарэгістраваны ў выканкоме, а таксама цэлая сетка гаражоў у дварах дамоў і на прылягаючых да іх тэрыторыях, устаноўленых грамадзянамі самавольна, без адпаведнага дазволу. Не вырашана пытанне будаўніцтва на тэрыторыі раёна платных ахоўваемых стаянак. Рашэннем выканкома намечаны меры па выпраўленню становішча. Жыллёва-рамонтна-эксплуатацыйны трэст і камунальны аддзел вядуць інвентарызацыю і праверку дзейнасці гаражна-будаўнічых кааператываў раёна, выяўляюць самавольна ўстаноўленыя і пабудаваныя гаражы.

Праведзена пэўная работа па рамонту, рэстаўрацыі і добраўпарадкаванню помнікаў гісторыі і культуры. Абноўлены надпісы на ўсіх помніках, устаноўлены ахоўныя знакі на помніках архітэктуры мясцовага значэння. Выкананы заказ на праекты ахоўных зон палаца-паркавага ансамбля г. Гомеля. На пасяджэнні выканкома разгледжана пытанне «Аб стане і мерах па паляпшэнню аховы помнікаў гісторыі і культуры». У выніку распрацавана праграма рэстаўрацыі помнікаў мясцовага значэння да святкавання 850-годдзя г. Гомеля.

Не можа не трывожыць той факт, што ў раёне ідзе працэс скарачэння калектываў мастацкай самадзейнасці. У культурна-асветных установах закрываюцца клубы і аб'яднанні па інтарэсах, практычна не развіваюцца дэкаратыўна-прыкладная і тэхнічная творчасць, не ўдасканальваецца матэрыяльна-тэхнічная база. Значна ўскладнілася фінансаванне культурна-спартыўнага комплексу, якое ажыццяўляецца за кошт сродкаў прадпрыемстваў, арганізацый раёна, што адмоўна адбілася на правядзенні работы з насельніцтвам па месцу жыхарства.

Выканком сістэматычна займаецца пытаннямі ўмацавання грамадскага парадку, павышэння адказнасці супрацоўнікаў аддзела ўнутраных спраў за захаванасць дзяржаўнай уласнасці, абарону маёмасці, гонару і годнасці грамадзян. Адшукваліся магчымасці ўмацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы міліцыі. Са спецыяльна створанага фонду «Правапарадак» на гэтыя мэты накіравана каля 200 тыс. руб. Прынята спецыяльнае рашэнне выканкома аб карэннай перабудове дзейнасці добраахвотных народных дружын, якое прадугледжвае іх фарміраванне пераважна з мужчын на платнай аснове. Распрацоўваюцца меры па рэалізацыі Закона Беларускай ССР «Аб міліцыі», якія дазволяць умацаваць аддзел унутраных спраў райвыканкома кадрамі, здольнымі істотна змяніць да лепшага аператыўную абстаноўку.

Больш актыўна працавала камісія па справах непаўналетніх. На яе пасяджэннях разгледжана 125 спраў, заведзеных на 147 цяжкіх падлеткаў. 109 падлеткам аказана дапамога ў працаўладкаванні.

Выканком прымае меры па ўдасканальванню арганізацыйна-масавай работы, больш поўна ўлічвае грамадскую думку, шырэй выкарыстоўвае ў сваёй рабоце галоснасць, сістэматычна інфармуе дэпутатаў аб сваёй дзейнасці. Дэпутаты маюць магчымасць знаёміцца з работай аддзелаў, прысутнічаць пры асабістым прыёме грамадзян, атрымліваць неабходныя звесткі аб разглядзе пісьмаў і заяў грамадзян. Перагледжаны і канкрэтызаваны функцыянальныя абавязкі кожнага работніка і рэгламент выканкома. Прапрацаваны ў арганізацыйным і фінансавым плане наказы, крытычныя заўвагі і прапановы выбаршчыкаў.

У апараце выканкома ствараецца абстаноўка нецярпімасці да фактаў безадказнасці і валакіты, няўвагі да патрэб людзей. З мэтай паляпшэння гэтай работы пытанні разгляду заяў грамадзян, арганізацыі іх прыёму рэгулярна разглядаюцца на пасяджэннях выканкома.

Праводзіцца мэтанакіраваная работа па прыцягненню сродкаў у мясцовы бюджэт, адшуканню дадатковых крыніц фінансавання, якаснаму выкананню даходнай і расходнай частак бюджэта. У 1990 годзе дадаткова накіраваны на мерапрыемствы, непрадугледжаныя па бюджэту, свабодныя рэшткі бюджэтных сродкаў у суме 4 млн. 432 тыс. рублёў.

